9. Луначарский, А. В. Доклад Наркомпроса на X-ом Всероссийском съезде советов / А. В. Луначарский // Народное просвещение. — 1923. — № 2. — С. 20.

10. О некоторых изменениях в составе и устройстве государственных ученых и высших учебных заведений / Декреты Советской власти / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Институт истории Академии наук СССР. Т. 3. [подгот. к печати С. Н. Валк и др.].: — Политиздат, 1964. — 664 с.

11. Работники просвещения / Директивы ВКП(б) по вопросам просвещения / под ред. И. Д. Давыдова. — 2-е доп. изд — Л.; М.: Народный ком. прос. РСФСР — тип. Им Воровскго, 1930. — 382 с.

12. РГАСПИ. — Фонд 17. — Оп. 60. — Д. 60. Л. 44. Доклад Народного комиссара по просвещению РСФСР.

13. Синецкий, А. Я. Профессорско-преподавательские кадры высшей школы СССР / А. Я. Синецкий. — М.: Советская наука, 1950. — 236 с.

14. Финкель, С. Советская власть и интеллигенция / Власть и наука, ученые и власть: 1800-е—нач. 1920-х гг.: Материалы международного научного коллоквиума / Отв. ред. Н. Н. Смирнов / С. Финкель. — СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. — С. 173—184.

15. Чанбарисов, Ш. Х. Формирование советской университетской системы (1917—1938) / Ш. Х. Чанбарисов. — М.: Высш шк., 1988. — 255 с.

**Ходзін Сяргей Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## РОЛЯ ВУЧОНЫХ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў ВЫПРАЦОЎЦЫ І РЭАЛІЗАЦЫІ КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БССР Ў 1920-Я ГГ.

Імклівыя працэсы глабалізацыі актуалізуюць пытанне аб магчымасці выбару ўласнай мадэлі развіцця. Сучасныя формы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця грамадства абапіраюцца на традыцыі, маральныя абавязкі, гістарычна сфарміраванае паняцце аб справядлівасці. Трансфармацыйныя працэсы па-рознаму ўздзейнічаюць на чалавека ў залежнасці ад узросту, полу, узроўню адукацыі і культуры, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы.

Розныя сацыяльныя формы мадэрнізацыі пад уплывам унутраных, а таксама знешніх фактараў могуць чаргавацца як этапы трансфармацыі грамадства. Мадэрнізацыя ў адрозненне ад трансфармацыі прадугледжвае дакладна вызначаныя мэты, якія стаяць перад грамадствам, неабходнасць палітычнай волі і наяўнасць эліты, якая гэтыя мэты фармулюе і рэалізуе. У выніку фарміруюцца розныя мадэлі і скіраванасць мадэрнізацыйных працэсаў, а іх змена прадугледжвае барацьбу эліт і транслюемага імі светапогляду.

Для разумення пераемнасці розных перыядаў нашай гісторыі выключнае значэнне мае вывучэнне сістэмы каштоўнасцей, звычак, традыцый, рэлігійных і міфічных уяўленняў, а таксама абумоўленых імі форм сацыяльных паводзін. Вяртанне да гісторыі як навукі аб чалавеку дазваляе ўлічыць спосабы, якімі культура ўплывае на чалавечыя паводзіны ўвогуле і эканамічныя паводзіны ў прыватнасці, а таксама садзейнічае разуменню гістарычна склаўшыхся ўяўленняў аб справядлівасці. Гісторыкі маюць справу не з нейкай абстрактнай чалавечай істотай, а з чалавекам, які жыве пэўным часам, у канкрэтнай мясцовасці, мае свой жыццёвы і генетычна запазычаны вопыт продкаў [1].

Спалучэнне геаграфічнага і гістарычных фактараў утварае пэўныя матывы гаспадарчых паводзін: «пачуццё агульнасці», «пачуццё справядлівасці». У сувязі з тым актуалізуецца сацыяльна-псіхалагічнае (ці ментальнае) вымярэнне гістарычнай рэчаіснасці. Паняцце менталітэту вызначаецца як спосаб, метад пазнання рэчаіснасці, які ўласцівы вызначанай сацыяльнай агульнасці і адлюстроўвае першасны, звычайны ўзровень успрыняцця. Можна пазначыць, што ва ўсходнееўрапейскім гістарычным працэсе на працягу стагоддзяў фарміраваліся своеасаблівыя адносіны да ўласнасці. «Народнае разуменне працы і яе права на пазямельную ўласнасць, — пісаў знакаміты беларускі гісторык М. В. Доўнар-Запольскі, — рэзка адрозніваецца ад разумення ўласнасці, якое зацвердзілася ў культурных слаях» [2, с. 276]. Невыпадкова, пры ўсіх разыходжаннях, базавыя дакументы БНР і БССР выяўляюць адзінства ў адмаўленні прыватнай уласнасці на зямлю. Першы Усебеларускі з'езд акрэсліваў сацыяльныя аспекты як найважнейшыя. Гісторыя, якая разглядаецца як пэўная паслядоўнасць часу, на самай справе, разгортваецца ў выглядзе пэўных альтэрнатыў на сходнай аснове.

Спалучэнне сацыяльнага з нацыянальным атрымала па выніках развіцця рашэнняў Першага Усебеларускага з'езду рэалізацыю праз стварэнне і ўмацаванне Беларускай савецкай Рэспублікі. На пэўным этапе развіцця БССР, з умацаваннем яе інстытутаў, мацнеў новы фактар, які можна было б назваць фактарам дзяржаўнасці. Інтарэсы рэспублікі як асобнага дзяржаўнага арганізма нярэдка не супадалі з інтарэсамі саюзнага цэнтра і прымушалі рэспубліканскія ўлады прымаць пад ўвагу найперш патрэбы БССР і адстойваць яе правы (што станавіліся аднačасова і ўласнымі інтарэсамі рэспубліканскай партыйна-гаспадарчай эліты, якая складвалася ў гэты перыяд). Фактар дзяржаўнасці (інтарэсаў Беларусі і яе інстытутаў) не заўсёды быў звязаны з фактарам нацыянальным і часам далёкім ад этнічнасці, бо любая дзейнасць, накіраваная на абарону паўнамоцтваў рэспублікі, аб'ектыўна садзейнічала ўмацаванню Беларусі як дзяржавы. «Значную ролю ў арганізацыі універсітэта выканаў удала падабраны на гэтую высокую пасаду рэктар універсітэта прафесар Уладзімір Пічэта, — адзначаў С. Кандыбовіч. — Ён не быў беларусам, але актыўна і добрасумленна праводзіў патрэбныя мерапрыемствы па ўмацаванні універсітэта» [3 с. 12]. Адстойваючы пазіцыі БССР, А. І. Крыніцкі (першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1924—1927 гг.) пісаў у сувязі са стварэннем Заходняй вобласці І. В. Сталіну «Беларусь — самастойная рэспубліка. Яна мае права мець упаўнаважанага пры Урадзе БССР, а не ў Смаленску» [4, арк. 279—280].

На працягу 1924—1928 гг. адбываецца фарміраванне і рэалізацыя нацыянальнай мадэлі савецкай мадэрнізацыі, прававая аснова якой была вызначана ў беларускім заканадаўстве, найперш, у Канстытуцыі БССР 1927 г. і Зямельным кодэксе БССР 1925 г. Важнейшымі характарыстыкамі мадэрнізацыі беларускай вёскі ў 1924—1928 гг. з'яўляліся апора на ўласныя прыродныя і сацыяльна-эканамічныя рэсурсы, улік традыцый і асаблівасцей гістарычнага развіцця. У аграрнай палітыцы беларускага кіраўніцтва яны выявіліся ў адмаўленні ўраўняльных падыходаў і абшчыны ў землекарыстанні, ва ўстанаўленні максімальных і мінімальных нормаў надзялення зямлёй. Асноўнымі кірункамі мадэрнізацыі сталі ўкараненне дасягненняў навукі, арганізацыя перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, меліярацыя, стварэнне шматфункцыянальных каапératываў.

Разумеючы ролю інтэлігенцыі і адукацыі, кіраўніцтва БССР канцэнтравала ўсе магчымыя рэсурсы на развіцці нацыянальнага ўніверсітэта як найважнейшага фактару мадэрнізацыі. У 1927 г. рост даходаў бюджэта замарудзіўся з прычыны завяршэння аднаўленчага перыяду і вычарпання экстэнсіўных фактараў развіцця (найперш, магчымасцяў лясной гаспадаркі і выкарыстання сельскагаспадарчых плошчаў). Бюджэтам 1927/1928 гг. вызначалася найперш задача рэканструкцыі народнай гаспадаркі, звязанай з індустрыялізацыяй краіны. Павелічэнне выдаткаў на сацыяльна–бытавую сферу не прадугледжвалася, сродкі неабходна было шукаць на месцах шляхам скарачэння адміністрацыйных расходаў, рацыяналізацыі і г. д. Павелічэнне бягучых асігнаванняў дапушчалася толькі на пабудову універсітэцкага гарадка БДУ. Пры гэтым, уся нагрузка па развіццю школы, медыцыны і іншых аб'ектаў сацыяльнай сферы ўскладалася амаль выключна на мясцовыя бюджэты.

Невыпадкова, што многія, з тых, хто першапачаткова падтрымаў ідэю Беларускай Народнай Рэспублікі, вярталіся ў БССР для рэалізацыі сваёй мары пабудовы нацыянальнай дзяржаўнасці. Сярод такіх асоб і частка прафесуры БДУ. Паколькі гісторыя бачыцца найбольш яскрава праз жыццё і дзейнасць пэўнага чалавека гэтага часу, спынімся на ўкладзе прафесара А. А. Смоліча ў справу нацыянальнай мадэрнізацыі.

Аркадзь Антонавіч Смоліч нарадзіўся 17 верасня 1891 г. у вёсцы Бацэвічы Бабруйскага павета ў сям'і сельскага святара (псаломшчыка). Гэтае асяроддзе, вельмі блізкае да беларускага сялянства і прыроды, фарміравала патрыётаў свайго краю. Бачылі і разумелі яго будучыню яны па- рознаму, але шчыра жадалі лепшага сваёй радзіме. Аркадзя Смоліча, безумоўна, вабілі новыя веды. Пасля заканчэння ў 1909 г. Мінскай духоўнай семінарыі, ён паступае ў Нова-Аляксандраўскі (Харкаўскі) інстытут сельскай гаспадаркі, дзе спецыялізуецца на адзінай у Еўропе кафедры глебазнаўства. Пазней Аркадзь Смоліч працягне адукацыю ў Кіеўскім політэхнічным інстытуце.

З 1914 г. А. А. Смоліч пачынае навуковую працу пад кіраўніцтвам праф. Чэлінцева і дацэнта Харкаўскага інстытута І. П. Караткова, праводзіць экспедыцыйнае даследаванне сялянскай гаспадаркі ў 10 губернях Украіны. Ён працуе ў якасці практыканта на Энгельгардаўскай сельскагаспадарчай доследнай станцыі, некаторы час быў участковым аграномам у Ігуменскім земстве. З 1917 г. А. А. Смоліч ў якасці намесніка загадчыка Мінскага губернскага статыстычнага бюро кіраваў сельскагаспадарчым перапісам 1917 года, распрацоўкай яго матэрыялаў. Як вынікае з яго «carriculum vitae», менавіта ў гэты перыяд ён пачаў пісаць сваю «Геаграфію Беларусі».

Ідэалам Аркадзя Смоліча з'явіліся ідэі сацыяльнай справядлівасці і беларускай дзяржаўнасці. Аркадзь Антонавіч — адзін з арганізатараў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Менавіта ён першым на вядомым паседжанні Рады вечарам 24 сакавіка 1918 г. прапанаваў абвясціць незалежнасць БНР. У першым складзе ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ён становіцца Народным сакратаром асветы, намеснікам Старшыні Рады БНР. Пасля пераезду ў Вільню, А. А. Смоліч выкладаў ў Віленскай беларускай гімназіі. Аркадзь Антонавіч стаў адным з заснавальнікаў і першым старшынёй (1921—1922) Таварыства беларускай школы, якое адыграла выключную ролю ў барацьбе насельніцтва Заходняй Беларусі за нацыянальную школу і культуру. Ён востра адчуваў неабходнасць выдання падручнікаў на беларускай мове. У выніку

выйшла ў свет «Геаграфія Беларусі», якая вытрымала пяць перавыданняў і якую да гэтага часу лічаць самай лепшай працай па агульнай геаграфіі Беларусі.

На Усебеларускім з’ездзе разам з Я. Ф. Карскім выступіў за неабходнасць адкрыцця беларускага універсітэта. Адстойваў гэтую ідэю, стаўшы першым сакратаром асветы ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі.

На пачатку 1920-х гг. для многіх прыхільнікаў беларускай нацыянальнай ідэі становіцца відавочным, што рэальнае дзяржаўнае будаўніцтва рэалізуецца ў Беларусі на савецкай аснове. Бальшавікі, якія атрымалі ўладу ў велізарнай сялянскай краіне, вымушаны былі адаптаваць марксісцкія пастулаты да пэўных умоў сялянскай краіны, што спрыяла выпрацоўцы «новай эканамічнай палітыкі». Акрамя ўсяго іншага, яна стварала магчымасці для ўліку нацыянальных традыцый развіцця. Відавочна, што такая палітыка фармавала запыт на спецыялістаў з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, і А. А. Смоліч не мог застацца ў баку ад гэтых імклівых працэсаў нацыянальнага жыцця.

У жніўні 1922 г., яшчэ да абвяшчэння амністыі дзеячам БНР, урад БССР дазваляе А. А. Смолічу вярнуцца ў Мінск. Аркадзь Антонавіч прызначаецца загадчыкам планава-эканамічнага аддзела Наркамата земляробства Беларускай рэспублікі, які ў той перыяд узначальваў А. С. Славінскі. Наркам земляробства не падтрымліваў ідэі сялянскага індывідуальнага землекарыстання, настойваючы на перспектывах калектыўнага працы ў сельскай гаспадарцы. Таму першапачаткова А. А. Смоліч канцэнтруецца на распрацоўцы навуковых асноў пераўтварэння вёскі. У 1923 годзе ён абараняе кандыдацкую дысертацыю «Арганізацыя сельскай гаспадаркі ў раёнах Цэнтральнай Беларусі». З 1922 г. становіцца паўнамоцным сябрам Інстытута Беларускай культуры (у сваёй анкеце ён напіша — «ганаровым членам» з 1921 г.). А. А. Смоліч таксама прапануе свае веды універсітэту, для адкрыцця якога ім было зроблена гэтак шмат намаганняў. 5 красавіка 1923 г. А. А. Смоліч быў залічаны навуковым супрацоўнікам Педагагічнага факультэта БДУ. У 1923 г. ён чытае курсы геаграфіі Беларусі і замежных краін, фарміруе кафедру краязнаўства, геаграфічны кабінет.

Характарызую навукова-грамадскую і палітычную платформу, да якой належаў А. А. Смоліч, варта падкрэсліць, што беларускія сацыялістычныя партыі, як і эсэры, адстойвалі патрабаванне адмены прыватнай уласнасці на зямлю. Такое патрабаванне было замацавана як ў Другой Устаўной грамаце БНР, так і ў Маніфесце Рабоча-Сялянскага Урада Савецкай Беларусі. Аднак разуменне справядлівасці не было звязана з ўраўняльнасцю. У беларусаў, якія жылі амаль выключна ў сельскай мясцовасці, у аснову ўсяго быў пакладзены прынцып працы. Асаблівае значэнне для беларускага селяніна мела зямля. Сялянская грамада заставалася найважнейшым рэгулятарам сацыяльных адносін, перш за ўсё ў сферы зямель агульнага карыстання (лес, выганы, сенажаць). Яна ўспрымалася як штосьці калектыўнае, аб’яднальны пачатак, у якім злучыліся нацыянальныя і сацыяльныя патрабаванні беларусаў. «А хто там ідзе, а хто там ідзе ў велізарнай такой грамады? Ідуць беларусы «, — пісаў беларускі паэт Я. Купала. «Зямля –самы каштоўны прадмет для беларуса», — падкрэсліваў М. В. Доўнар-Запольскі [5, с. 43—44]. Шырока вядомыя словы Янкі Купалы з паэмы «Новая зямля»: «Зямля — Аснова ўсёй Айчыне». Зямля звязвалася ў свядомасці беларуса з родам, з вечнасцю, праца на зямлі селянін лічыў самым значным.

Нацыянальная гаспадарчая сістэма ў канцэнтраваным выглядзе ўяўляе механізм фарміравання і рэалізацыі эканамічных інтарэсаў, які склаўся ў краіне. Захаванне і развіццё сялянскай гаспадаркі ў 1920-я гг. вызначалася тым, што аграрная сфера вытворчасці ў яе большай частцы будавалася не толькі на капіталістычных, але і на безнаёмных асновах сямейнай гаспадаркі, для якой характэрны зусім іншыя матывы гаспадарчай дзейнасці, а таксама спецыфічнае разуменне рэнтабельнасці. А. В. Чаянаў сцвярджаў, што для кожнага тыпу эканамічнага ўкладу павінна быць створана эканамічная сістэма, якая адпавядае яго спецыфіцы. Гаспадарчая сістэма фарміруецца пад уплывам такіх істотных сацыяльных фактараў, як шчыльнасць насельніцтва і формы землекарыстання, а таксама традыцыйны ўклад жыцця. Цесна пераплеценыя з ім звычкі і звычаі прадвызначаюць пэўны узровень патрэб, а такім чынам, — і напружанасць працы селяніна [6]. Вельмі складана вызначыць нейкі тып «чыстай культуры»: элементы класічных сістэм суіснуюць, ствараючы спецыфічныя — для кожнай краіны на пэўным этапе развіцця — кангламераты. Дылема «рынак або дзяржаўнае рэгуляванне» можа вырашацца наяўнасцю гаспадарчых («экспалярных») сістэм, якія знаходзяцца па-за межамі дзвюх полюсаў — плану і рынку.

Важнай умовай паспяховага развіцця сялянскай гаспадаркі з'яўляецца ўлік прыродна-геаграфічнага і лагістычнага фактару. Каб наладзіць культурную гаспадарку, здольную даваць канкурэнтаздольную прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках, трэба было правесці новае эканамічнае раянаванне з улікам гістарычных абставін, асаблівасцей эвалюцыі сялянскай гаспадаркі, шчыльнасці насельніцтва, транспартных шляхоў, коштаў на тавары сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама сацыяльна-псіхалагічнага фактару. Значную навуковую і практычную работу ў гэтым кірунку праводзіў Навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, непасрэдна А. А. Смоліч. Праведзенае ім вывучэнне паказала, што асноўныя прычыны нізкай прыбытковасці сялянскай гаспадаркі вызначаюцца недахопам сродкаў вытворчасці, адсутнасцю зберажэнняў і інвестыцый у гаспадарку, высокімі падаткамі.

У сярэдзіне 1920-х гг. у БССР была рэалізавана вялікая праца па раяніраванню, якую М. І. Калінін прыводзіў у якасці прыкладу для ўсяго Саюза ССР. А. А. Смоліч не толькі займаўся тэарэтычнымі пошукамі, але і быў накіраваны на іх як мага больш хуткую практычную рэалізацыю. Распрацоўваючы магчымасці беражлівых і комплекснага выкарыстання прыродных багаццяў Беларусі, ў 1924 г. ён прыняў удзел у працы камісіі Дзяржплана БССР па раянаванню тэрыторыі рэспублікі. А. А. Смоліч настойваў на неабходнасці ўліку глебавых, гідралагічных, кліматычных і іншых прыродных умоў. Істотным фактарам з яго пункту гледжання з'яўлялася таксама лагістыка: наяўнасць буйных гарадоў, чыгуначных станцый і г. д.

Нягледзячы на тое, што сялянства атрымала прырэзку зямлі каля 1 млн дзесяцін, для Беларусі вельмі востра з'яўлялася праблема аграрнай перанаселенасці, лішак рабочай сілы даходзіў тут да 40 % [7, арк. 112]. На пачатку 1927 г. наркам земляробства БССР падкрэсліваў, што «падзел сялянскіх гаспадарак дасягнуў неверагодных памераў. Кожны год павялічвалася колькасць дробных сялянскіх гаспадарак на 15 000, у той час, як у першыя гады пасля рэвалюцыі яна ўзрастала на 8 000» [8, арк. 551]. У густанаселеных ці малазямельных раёнах недахоп зямлі пазбаўляў сялянскую сям'ю магчымасці рэалізаваць

сваю рабочую сілу ва ўмовах аптымальных форм арганізацыі працы. Не валодаючы дастатковым запасам зямлі і сродкаў вытворчасці для поўнага выкарыстання сваёй працы ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве, яна размяшчала лішак сваёй працы ў іншы від гаспадарчай дзейнасці. У Беларусі спроба пераадолець аграрную перанаселенасць выяўлялася і ў пашырэнні больш працаёмкіх культур — бульбаводства, ільнаводства, развіцці жывёлагадоўлі і падсобных промыслаў [1, с. 82—107].

Важнейшай рысай эканамічнай палітыкі ў Беларусі акрэсліваўся разлік на ўласныя рэсурсы. У сувязі з тым беларускі ўрад арыентаваў на максімальна беражлівы падыход да іх выкарыстання. Вялікія кошты на драўніну стымулявалі самавольныя вырубкі [9, арк. 1, 4]. Згаджаючыся з тым, што пытанне аб лесе набыло надзвычайную вастрыню, М. М. Карклін, які ўжо рыхтаваўся заняць пасаду Старшыні Дзяржплана БССР, выступіў супраць просьбаў сялянства адпускаць лес бясплатна, сцвярджаючы, што гэта «сфарміруе дзірку ў бюджэце». Па яго меркаванні, наадварот, лес павінен быў прыносіць большы даход. «Нам патрэбна кожнае балота, пень, вярхушкі выкарыстоўваць, каб змаглі паставіць справу так, як патрэбна» — заявіў ён на X з’ездзе КП(б) Беларусі. І паабяцаў, што гэтая праца будзе цесна ўвязвацца з пытаннем аб торфе [10, арк. 511—513].

Абгрунтоўваючы неабходнасць максімальнага ўліку прыродна-геаграфічных ўмоў з мэтай разліку на ўласныя рэсурсы Беларусі, А. А. Смоліч распрацаваў тэорыю рацыянальнага размяшчэння гаспадарчых комплексаў (эканомгеаграфічных ландшафтаў) [11]. У іншых умовах, на думку А. А. Смоліча, было б надзвычай складаным адстаяць ідэю незалежнасці краіны. На мяжы 20—30-х гг. XX ст. А. А. Смоліча напаткаў лёс многіх з прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Шэраг сучаснікаў, магчыма, ацэняць зроблены А. А. Смолічам крок як не вельмі прагматычны. Аднак Аркадзь Антонавіч паказаў прыклад для наступных пакаленняў, што ўяўляе сапраўдны патрыёт сваёй справы, сваёй краіны. Ён быў з тых, хто шчыра імкнуўся рэалізаваць ідэі Першага Усебеларускага з’езда, працуючы дзеля агульнай мэты праз кансалідацыю нацыянальных сіл.

## Бібліяграфічны спіс

1. Ходзін, С. М. Дэмаграфічныя змены ў сельскіх населеных пунктах БССР (1921—1939 гг.) / С. М. Ходин // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. — Мінск, 2015. — Вып. 30. — С. 171—176.

2. Довнар-Запольский, М. Очерки обычного семейственного права крестьян Минской губернии / М. Довнар-Запольский // Этногр. обозрение. — 1897. — № 2. — С. 1—16.

3. Кандыбовіч, С. Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / С. Кандыбовіч; аўт. прадм. В. Скалабан. — Мінск: Часоп. «Беларус. гіст. агляд», 2000. — 158 с. — (Бібліятэка часопіса «Беларускі гістарычны агляд»).

4. Проект постановления бюро ЦК КП(б) от [1924 г.] о праздновании Дня провозглашения БССР, постановление СНК БССР от 6 декабря 1924 г. о надписях и вывесках на национальных языках, протокол заседания комиссии при ЦКК КП(б)Б от 20 декабря 1924 г. по вопросу выселения быв.помещиков из принадлежащих им хозяйств, проект наказа СНК, СТО и комиссий при СНК СССР, план работы президиума ЦКК КП(б)Б на октябрь 1924 г. — март 1925 г., отчеты о работе президиума ЦКК КП(б)Б с 15 мая по 1 сентября 1924 г. и Могилевского окружкома КП(б)Б с мая по август 1924 г.,

тезисы докладов о финансовом положении БССР, доклад управления коммунального хозяйства НКВД БССР «Дорожное строительство Белоруссии и задачи райисполкомов». 21 марта — 31 декабря 1924 г. 289 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1500.

5. Довнар-Запольский, М. В. Исследования и статьи [Электронный ресурс] / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Тип. 1-й Киев. артели печ. дела, 1909. — Т. 1: Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. — Режим доступа: http://by.ethnology.ru/by_lib/dov-zap_01/graf/dov-zap_01_cont.html. — Дата доступа: 17.01.2016.

6. Чаянов, А. В. К вопросу теории некапиталистических систем хозяйства / А. В. Чаянов // Экономическое наследие А. В. Чаянова: труды / А. В. Чаянов. — М., 2006. — С. 59—106.

7. Документы о состоянии сельского хозяйства и очередных задачах аграрной политики в БССР (доклады, тезисы докладов, сведения, выводы и др.). 18 февраля — 31 июля 1925 г. 375 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2295.

8. Стенограмма XIV съезда КП(б)Б от 26 [27] января 1932 г. 286 арк. // НАРБ. — Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5590.

9. Бланки, отчеты, сведения. 1 января 1925—31 декабря 1925. 397 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2292.

10. Стенограмма X съезда КП(б)Б от 3—10 января 1927 г. 708 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3083.

11. Смоліч, А. Сельскагаспадарчыя раёны Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1927—1928 гадах: папярэд. схема і мэтадал. увагі / А. Смоліч. — Мінск: [б. в.], 1930. — 138 с.

**Яноўскі Алег Антонавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## РЭВАЛЮЦЫІ 1917 ГОДУ Ў ЛЁСАХ ПЕРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ

Безумоўна, падзеі 1917 г. аказалі вызначальны ўплыў не толькі на змену палітычнага развіцця Беларусі, але і на лёсы тых, хто на пачатку 1921 г. так ці інакш стане прыхіляцца да ўдзелу ў стварэнні першага беларускага ўніверсітэта. Калі нейкім чынам з гэтага падыходу абагульняць той час, то натуральна казаць аб сумяшчэнні і ўзаемадапаўняльнасці вялікіх і малых катэгорый гістарычнага руху: сам універсітэт стаў рэальнасцю з-за рэвалюцыйнага ператрусу, а яго стваральнікі далучыліся да рэалізацыі даўно наспеўшай ідэі менавіта таму, што абедзьве рэвалюцыі 1917 г. літаральна выкінулі інтэлектуалаў са звыклых месц працы і побыту. Таксама, як і тыя палітыкі, што прынялі рашэнне аб пачатку дзейнасці ўніверсітэта ў Мінску: яны былі высунуты на першасныя ролі ў заблытанай і дастаткова выпадковай па сваіх наступствах ваенна-палітычнай і грамадскай сітуацыі 1917—1920-х гадоў.

З пазіцый гэтага спрошчанага і вельмі агульнага падыходу існуе магчымасць дэталізаваць некаторыя абставіны, разглядзіць дакладныя шляхі, якія былі пройдзены дзесяткамі ідэолагаў, арганізатараў і непасрэдных стваральнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па-сутнасці, і сёння не створана дэталёва прапісаная гісторыя тых, каму беларусы абавязаны сваім стогадовым узыходжаннем па прыступках навукі і вышэйшай адукацыі. Гэта значыць, пакуль што не напісаны нейкі энцыклапедычны твор, які б таксама